Cana asobnaha numaru 20 hr. Pierasylka apłačana ryčałtam

Nr. 23 (568). Wilnia, Sierada 30 Traŭnia 1934 h. Hod X (XVIII).

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i literaturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčynlena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

„Biel. KRYNICA" kaštuje na hod—4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy—1 zał. Zahranicu ŭdwaja daražej. Ceny abwiestak pawodle ŭmowy.

Выбары ў гарадзкія самаўрады і Беларусы.

Нядаўна на землях нашага краю адбыліся «выбары» ў гмінныя рады. Цяпер адбываюцца падобныя-ж выбары ў гарадзкія рады.

У Вільні яны адбудуцца 10 VI. Для гэтай мэты тут ужо прыгатаваны сьпіскі выбаршчыкаў; уся Вільня падзелена на шэсьць вокругаў і кожны вокруг выбірае пэўны лік прадстаўнікоў; усіх маючых права галасаваць грамадзян налічаюць 103 тысячы. Каб быць выбраным на радніка ў гарадзкую раду, трэба атрымаць каля 1200 галасоў.

Пачалася ўжо агітацыя. Сярод польскіх партыяў ваююць між сабой заўзята эндэкі і пілсудчыкі. Першым памагае каталіцкае духавенства — і гэта, пэўнеж, не бяз ведама арцыб. Ялбжыкоўскага — а другія, як урадавая партыя, і «самі» сабе даюць раду.

Рыхтуюцца так-жа да выбараў у віленскую гарадзкую раду польскія соцыялісты (PPS) і розныя партыі жыдоўскія.

Расейцы, з таго часу, як узяў іх у апеку Піманаў, страцілі пачуцьцё свайго нацыянальнага гонару і ходзяць на павадку польскай санацыі (пілсудчыкаў), з якімі ідуць і цяпер на выбары.

Літоўцы, як паведамляе іх прэса, на выбары ў віленскую гарадзкую раду ня йдуць. Вось як аб гэтай справе між іншым піша «Viln. Žodis» (№ 10, з 20.V. сёл. г): ...„Учасьце ў выбарах важная рэч. Біручы ўчасьце ў выбарах літоўцы маглі-б парушыць свае масы, каб разбудзіць у іх грамадзкае жыцьцё праз абарону правоў іх, падчас выбараў літоўскі работнік меў-бы нагоду падумаць, як было дагэтуль, як ёсьць і як павінна быць Выбарная барацьба ўзбудзіла-б людзкую амбіцыю, без якой немагчымы ніякі поступ. Тады-б людзі пашукалі прычын сяньняшняга ліха. Літоўцы, біручы ўчасьце ў выбарах, маглі-б аднавіць — апошнімі часамі значна азімнеўшыя — адносіны з нацыянальнымі меншасьцямі...

Словам, была-б нагода пашырыць народную сьведамасьць шырокіх літоўскіх масаў у Вільні і паказаць гэную сьведамасьць публічна. Гэта з прычыны самых выбараў...

Але што б прынесьлі нам і памысныя для нас выбары? Калі цяперашняя ўлада і новы самаўрадавы закон не бярэ пад увагу дэмократызму — прынцыпу кіравацца людзям самым, дык абаронай літоўцам астаецца палітыка няўчасьця ў выбарах. Ды вось што бачым мы з быўшымі радамі. Улада з іх пастановамі ня лічыцца, бюджэт адкідае па колькі разоў, у найдрабнейшыя яе справы ўмешваецца, а ўрэшце разганяе і назначае свайго камісара... У гэткіх варунках быць у радзе—карысьці нямнога..."

Прычыны, як бачым, што змусілі літоўскае грамадзянства ад выбараў у віленскую гарадзкую раду ўстрымацца, цалком слушныя.

З такіх і ім падобных прычын ад гэтых выбараў устрымліваюцца і беларусы.

Беларускі Нацыянальны К-т, што аб'ядновае ў сабе ўсе беларускія незалежныя арганізацыі, на сваім агульным гадавым сходзе 23.V сёл. г. пастанавіў ня браць учасьця і ня выстаўляць сваіх сьпіскаў ня толькі ў выбарах у віленскую раду, але так-жа і ў іншыя гарадзкія рады. Прычыны гэтай пастановы: антыдэмократычны новы самаўрадавы закон і «мілыя» ўспаміны аб нядаўных выбарах у рады гмінныя.

Пастанова гэта, — ясная рэч, — ня ёсьць супярэчнай з паступкамі тых многіх беларусаў Зах. Беларусі, якія праз увагу на розныя мясцовыя варункі і патрэбы, такім ці іншым спосабам прымалі ўдзел у выбарах у гарадзкія рады, якія адбыліся 27.V. с. г. і на сваю руку, біручы выключна на сябе адказнасьць, нават кандыдавалі і былі ў гэныя рады выбраны. Будуць яны жывымі сьведкамі польскай у нас гаспадаркі.

І вось, ня гледзячы на тое, што бел. арганізацыі сваіх кандыдацкіх сьпіскаў не выстаўлялі, ня гледзячы на ўсе стараньні польскага про-ўрадавага фронту правесьці толькі сваіх людзей, паводле апошніх газэтных вестак беларусаў у гарадзкія рады Заходняй Беларусі прайшоў даволі значны працэнт.

Гэта йшчэ адзін знак — на злосьць нашым ворагам — аб сапраўднай жывучасьці беларускай і аб тым, як глыбока ў беларускія гушчы запусьцілі свае карэньні беларускі народны рух.

ГРАМАДЗЯНЕ Усе на ніву культуры! Гдзе няма, — арганізуйце гурткі Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, а гдзе ўжо заложаныя — узмоцніце ў іх працу!

Рэзалюцыі Беларускага Нацыянальнага Камітэту,

прынятыя на агульным сходзе дня 23.V.1934 г.

Агульны сход Беларускага Нацыянальнага Камітэту, рэпрэзэнтуючы незалежна арганізаванае беларускае грамадзянства, гэтым сьцьвярджае, што ў Зах. Беларусі, якая знаходзіцца ў граніцах сучаснай Польскай дзяржавы, патрэбы Беларускага народу, як нацыі, не здаволены ў жыцьці: народна-палітычным, самаўрадавым, гаспадарча-эканамічным, культурна-асьветным, рэлігійным і іншым.

Польская нацыяналістычная палітыка давяла да таго, што Беларускі народ з Зах. Беларусі ня мае належнага прадстаўніцтва ў законадаўчых установах дзяржавы.

Апошнія „выбары" з 1933—1934 г. у самаўрады ў нашым Краю, аб каторых шырока пісала і цяпер піша прэса, даказалі, што Беларускі народ ня можа выявіць сваю волю і пастанаўляць у справах датычачых інтарэсаў народна-беларускіх, якія адносяцца да функцыяў самаўраду.

У галіне эканамічна-гаспадарчай праводзіцца палітыка выключнага крэдытаваньня польскіх эканамічна-гаспадарчых арганізацыяў і ўстановаў; паддзержываецца на беларускіх землях польскае асадніцтва; ня гледзячы на нябывалую галіту нашай вёскі, з беларускага насельніцтва зьбіраюцца вялікія падаткі.

У культурна прасьветным жыцьці Беларусоў у Зах. Беларусі застасавана ў навучаньні дзяцей спрэчная з духам народнага ўзгадаваньня і пэдагогікі чужамоўнае школьніцтва; у пачаткавых школах польскія вучыцялі вучаць беларускіх дзяцей выключна толькі папольску.

У рэлігійным жыцьці: сярод беларускага праваслаўнага насельніцтва ў Зах. Беларусі маскоўскае духавенства, як вышэйшае, так і ніжэйшае ў царкоўным жыцьці ўпорыста ўтрымлівае расейшчыну, заводзячы ў некаторых мясцох і польшчыну, а пры помачы каталіцкага касьцёлу польскае духавенства, на чале з польскімі біскупамі польшчыць беларусоў каталікоў.

Біручы пад увагу вышэйсказанае, Беларускі Нацыянальны Камітэт ад імя незалежна арганізаванага беларускага грамадзянства ў Зах. Беларусі дамагаецца:

1) Ад польскага ўраду:

а) даць магчымасьць Беларускаму народу мець сваіх прадстаўнікоў у найвышэйшых законадаўчых установах дзяржавы і краю, каб магчы там бараніць інтарэсаў Беларускага народу;

б) справядлівага і поўнага самаўраду ў Зах. Беларусі, бяз ніякага націску ў кіраўніцтве самаўрадамі з боку адміністрацыйнай дзяржаўнай улады;

в) правядзеньня ў Зах. Беларусі справядлівай зямельнай рэформы, надзяляючы поўназямельнымі гаспадаркамі беззямельных і малазямельных беларускіх сялян;

г) аблягчэньня як дзяржаўных, так і самаўрадавых падаткаў, бо сяляне ня могуць іх выдзержаць;

д) выдачы з дзяржаўнага скарбу доўгатэрміновых крэдытаў на пашырэньне беларускай вытворчай і спажывецкай коопэрацыі;

е) адчыненьня па ўсей Зах. Беларусі беларускага школьніцтва пачаткавага і сярэдняга ў ліку прапарцыянальным да беларускага насельніцтва і заснаваньня для гэтага школьніцтва адумысловага беларускага школьнага дэпартаманту;

ж) вызначэньня дзяржаўнай падмогі для беларускіх культурных арганізацыяў;

з) высыгнаваньня прапарцыянальнага ліку стыпэндыяў для беларускага студэнства, з тым, каб памагчы незаможным беларускім студэнтам здабыць вышэйшую асьвету і падзелу гэтых стыпэндыяў толькі паводле поступу ў навуках і матэрыяльнага палажэньня;

і) агулам усіх правоў, якія належацца Беларускаму народу на падставе аснаўных законаў, міравых трактатаў; прыроднага права на існаваньне, як асобнай нацыі.

2) Ад Праваслаўнай Духоўнай улады:

а) спыненьня ў царкоўна-рэлігійным жыцьці на беларускіх землях шкоднай Царкве і Беларускаму народу палітыкі, якою пры помачы Праваслаўнай Царквы ўтрымліваецца ў рэлігійным жыцьці праваслаўных беларусоў расейшчына, а ў некаторых мясцох заводзіцца польшчына;

б) беларускіх пропаведзяў у цэрквах на беларускіх землях;

в) навучаньня рэлігіі беларускіх дзяцей у роднай мове—пабеларуску.

3) Ад Каталіцкіх Духоўных уладаў:

а) спыненьня палітыкі ў рэлігійным жыцьці беларусоў-каталікоў, якою пры помачы Каталіцкага Касьцёлу польшчыцца беларускае каталіцкае насельніцтва;

б) увядзеньня ў касьцёл на беларускіх землях беларускай мовы ў казаньнях і дадаткавых набажэнствах;

в) навучаньня беларускіх дзяцей рэлігіі ў роднай мове.

Аб беларускім жыцьці пад Саветамі.

Беларускі Нацыянальны Камітэт рашуча пратэстуе:

а) проціў нішчэньня Беларускага народу ў Савецкай Беларусі фізычна,

б) проціў нішчэньня Беларускага народу як нацыі,

в) проціў прасьледаваньня беларускай інтэлігенцыі, увязьненьня лепшых культурных беларускіх дзеячоў і высылкі іх з граніц Савецкай Беларусі.

Пры гэтым Беларускі Нацыянальны Камітэт заклікае ўсё сьведамае беларускае грамадзянства і ўсе беларускія арганізацыі стварыць супольны фронт у гэтых дамаганьнях, а так-жа праводзіць беларускае ўсьведамленьне, якое магло-б супрацівіцца ўсякай варожай нашаму народу палітыцы.

За Агульны Сход Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні

Прэзыдыюм

(—) *Я. Пазьняк* Старшыня К-ту. (—) *В. Багдановіч* I. Віцэ-старшыня. (—) *М. Манцэвіч* II. Віцэ-старшыня.

(—) *А. Клімовіч* скарбнік (—) *Ул. Казлоўскі* сэкрэтар.

АГУЛЬНЫ ГАДАВЫ СХОД

абноўленага на 1934-35 г. БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА КАМІТЭТУ.

23 траўня с. г. адбыўся ў Вільні звычайны гадавы сход Беларускага Нацыянальнага К-ту, пасьля абнаўленьня яго на 1934-35 год.

Адчыненьне Сходу.

На сходзе прысутных прадстаўнікоў 21. Сход адчыніў старшыня К-ту Ян Пазьняк. Пасьля правядзеньня фармальнасьці прыняцьця новаўступаючай у К-т групы Беларускіх Нацыянальных Соцыялістаў, старшыня Пазьняк запрапанаваў сходу выбраць кіраўніка сабраньня. На старшыню сходу аднагалосна быў выбраны грам. В. Войтэнка, на сэкрэтара— грам. М. Манцэвіч.

Пасьля выбараў прэзыдыюму сходу і праверкі мандатаў сяброў К-ту ўстаноўлены гэткі парадак дня: 1) Справаздача Прэзыдыюму К-ту з дзейнасьці за 1933-34 год, 2) Дыскусія над справаздачай, 3) Выбары Старшыні і Прэзыдыюм К-ту на 1934-35 г. 4) Пастановы сходу, 5) Арганізацыя Камісіяў і 6) Бягучыя справы.

Справаздача з дзейнасьці за 1933-34 год.

Пасьля ўстанаўленьня парадку дня было дадзена слова старшыні К-ту Я. Пазьняку, які ад імя Прэзыдыюму. К-ту даваў справаздачу за 1933-34 г.

Справаздаўца падзяліў сваю справаздачу на гэткія часьці: 1) справа ідэова-палітычная, 2) дзейнасьць арганізацыйная, 3) агульная сума працы К-ту за 1933-34 г.

1) Што датычыць палітычнай плятформы Беларускага Нац. К-ту, дык аб гэтай справе трэба сказаць наступнае: Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні заснаваўся ў 1919 годзе, бяручы ў падставу сваей ідэовай дзейнасьці Акт 25 сакавіка 1918 году. Ад таго часу да сяньняшняга дня Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні аб'ядноўвае незалежніцкія беларускія народныя арганізацыі і інстытуцыі ў Зах. Беларусі, бароніць правоў Беларускага народу ва ўсіх галінах яго жыцьця пад Польшчай, імкнучыся супольным агульна беларускім фронтам да поўнай самабытнасьці Беларускага народу.

Па гэтай лініі Прэзыдыюм Бел. Нац. К-ту і агулам увесь Камітэт праводзіў сваю палітычную дзейнасьць і ў мінулым 1933-34 годзе. Гэта пацьвярджаюць апублікаваныя пастановы К-ту, яго рэзалюцыі і адозвы, а так-жа публічныя выступленьні і дзейнасьць паасобных сяброў, выступаўшых ад імя К-ту.

2) Арганізацыйная дзейнасьць Прэзыдыюму К-ту ў мінулым годзе праводзілася пад знакам аб'ядныванья беларускіх народных сілаў пад сьцягам Бел. Нац. К-ту.

У рэзультаце гэтай дзейнасьці ў Камітэт уступілі: Беларускае Дабрадзейнае Т-ва ў Стоўпцах і новазаснаваўшаяся група Беларускіх Нацыянальных Соцыялістаў, прысылаўшыя ў Нац. К-т сваіх прадстаўнікоў.

Цяпер, пасьля абнаўленьня на 1934-35 год, Беларускі Нацыяналь- К-т складаецца з 26 асоб, прадстаўнікоў ад розных беларускіх народных арганізацыяў і інстытуцыяў у Зах. Беларусі, згодна з рэгулямінам К-ту: па 3-х прадстаўнікоў ад палітычных партыяў і па 2-х прадстаўнікоў ад іншых арганізацыяў.

У нутры К-ту сарганізаваны дзьве Камісіі: а) Беларуская Праваслаўная Камісія, якая бароніць правы бел. народу ў жыцьці царкоўным і б) Беларускі Каталіцкі Цэнтр, які таго-ж народу бароніць правы ў жыцьці касьцельным.

3) Агульная сума працы К-ту за 1933-34 год прадстаўляецца меньш-больш гэтак: агульных сходаў было 5; на адным сходзе між іншым абгаворана было палажэньне Беларускага народу эканамічнае, культурна-прасьветнае, рэлігійнае, і самаўрадавае ў граніцах сучаснай Польскай дзяржавы. У гэтай справе выданы і апублікаваныя рэзалюцыі з дня 5 VII.1933 г. з дамаганьнямі:

I. Ад польскага ўраду:

а) правядзеньня ў Зах. Беларусі зямельнай рэформы, пры каторай былі-б надзелены да поўназямельля беззямельныя і малазямельныя беларускія сяляне;

б) адчыненьня беларускіх пачаткавых школ на падставе зложаных беларусамі школьных дэклярацыяў ад 1926 да 1930 году ўключна і вольнага розьвітку беларускага сярэдняга школьніцтва,

в) у самаўрадавым жыцьці — поўнага самаўраду на беларускіх землях пад Польшчай;

г) агулам — рэалізацыі закону польскай конституцыі і міжнародных забавязаньняў, гварантуючых у межах Польскай дзяржавы правы разьвіцьця народнай культуры, свабоду нацыянальную і рэлігійную так-жа і Народу Беларускаму.

2. Ад Праваслаўнай Духоўнай улады:

а) правядзеньня беларусізацыі царкоўнага жыцьця на беларускіх землях;

б) беларускіх пропаведзяў;

в) навучаньня рэлігіі беларускіх дзяцей у школах пабеларуску.

3. Ад Каталіцкіх Духоўных уладаў:

а) спыненьня полёнізацыі беларусаў каталікоў, праводжанай польскімі ксяндзамі пры помачы каталіцкага касьцёлу;

б) павароту ксяндзоў беларусаў у беларускія парафіі;

в) увядзеньня ў касьцёл на беларускіх землях беларускай мовы ў казаньнях і дадатковых набажэнствах і

г) навучаньня дзяцей беларускіх рэлігіі ў роднай мове.

На наступным сходзе 29.9.33., побач з другімі справамі, прынята да ведама справаздача інж. А. Клімовіча з учасьця яго на міжнародным Кангрэсе Нацыянальных Меншасьцяў у Бэрне Швайцарскім, дзе ён выступаў ад Беларускага Нац. К-ту, рэпрэзэнтуючы Беларусаў у Польскай дзяржаве. Прамова інж. Клімовіча на ўспомненым кангрэсе аб палажэньні беларусоў пад Польшчай была польскімі ўладамі сканфіскавана.

На чаровым сходзе 21.X.33 г. усебакова разгледзіўшы і абгаварыўшы палажэньне тае часткі Беларусі, што знаходзіцца пад маскоўскай камуністычнай уладай, Камітэт пастанавіў выдаць пратэст: супроць нішчэньня Беларускага народу фізычна, супроць душэньня беларускай культуры і агулам беларускага народнага жыцьця і супроць рэформы беларускай мовы, упадабняючай яе да мовы расейскай. (Рэзалюцыя з дня 21 кастрычніка 1933 г.)

25 сакавіка сёл., ў 16-тыя ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларусі, Камітэт ладзіў урачыста абходзіны гэтага народнага сьвята Беларускага народу.

Паседжаньняў Прэзыдыюму К-ту было так-жа 5. На паседжаньнях гэтых абгаварваліся пераважна ўнутраныя справы К-ту, справы арганізацыйныя і падгатаўляліся справы на агульны сход, а так-жа абгаварваліся спосабы выкананьня пастановаў агульнага сходу К-ту.

Пры гэтым трэба сказаць і аб дзейнасьці Камісіяў К-ту.

Беларускай Праваслаўнай Камісіі адбыліся 4 паседжаньні. Высланы Вышэйшым Духоўным уладам два мэморыялы з дамаганьнем увядзеньня ў рэлігійнае жыцьцё праваслаўных беларусаў роднай беларускай мовы. Выдана адозва да народу. Наладжаны кантакт з праваслаўнымі ўкраінцамі і распачата акцыя падаваньня пісьменных дамаганьняў роднай мовы ў царкве. Гэткае дамаганьне праведзена ў Чэрасе, Браслаўскага пав. і праводзіцца ў другіх прыходах.

Царкоўныя вышэйшыя ўлады ўсьцяж абяцаюць здаволіць рэлігійныя патрэбы праваслаўных беларусаў, але прыабяцаўшы—далей упорыста ўтрымліваюць у цэрквах на беларускіх землях маскоўшчыну, а сьвяшчэньнікі маскалі ў некаторых мясцох вучаць дзяцей беларускіх нават папольску, але не пабеларуску.

Беларускі Каталіцкі Цэнтр агранічыўся на адным паседжаньні, выдаючы пратэст супроць полёнізацыі беларусаў—каталікоў польскім каталіцкім духавенствам пры помачы Каталіцкага Касьцёлу,—дамагаючыся ад Духоўных Касьцельных уладаў унармаваньня рэлігійнага жыцьця сярод беларусаў у Польшчы. Гэты пратэст з дамаганьнем высланы мясцовым каталіцкім біскупам і Апостальскаму Нунцыю ў Варшаве.

На гэтым справаздача была закончана.

Пасьля дыскусіі, справаздача была сходам прынята да ведама і выражаны Прэзыдыюму К-ту поўны давер.

III. Выбары старшыні і прэзыдыюму Камітэту на 1934-35 г.

На старшыню К-ту вялізарнай большасьцю галасоў выбраны Ян Пазьняк. У прэзыдыюм К-ту тайным галасаваньнем выбраны: Вячэслаў Багдановіч, Адольф Клімовіч, Мікалай Манцэвіч і Уладыслаў Казлоўскі. На заступнікаў выбраны Альбін Стэповіч і Віктар Войтэнка.

Пасьля выбараў сарганізаваны 3 камісіі: Праваслаўная, Каталіцкая (Каталіцкі Цэнтр) і Школьная Камісія.

Wincuk Adwažny.

4)

Chłapiec.

POWIEŚĆ.

III. A—be—ce.

Na pierałomie wiakoŭ, kala 1900-ha hodu, carskaja ŭłada ŭ Rasiei ličyłasia wonkach ŭsiomahutnaj, ale ŭnutry ŭrad peŭnaści nia mieŭ. Rasieja — heta byŭ ahramadny dub, katory swaimi sukami hłušyŭ kruhom usie słabyja drewy, ale sam užo ŭnutry byŭ sparachnieŭšy. Carskija ŭradaŭcy pieraniuchawali kožnaha padazronaha, wyśledžwali niezdawolenych, a na Biełarusi wielmi pryhniatali katalikoŭ-biełarusaŭ, za ich jakoby „polskija intryhi." Hetaja wiečnaja padazronaść palicyi, a z druhoha boku — abarona katalickaj wiery praz ksiandzoŭ, — wytwaryli pamiž prostym, ciomnym biełaruskim narodam jarki padzieł na „ruskich" — prawasłaŭnych i „polskich" — katalikoŭ. Nawiet samyja zajadłyja maskali zahaniali biełarusaŭ u polski aboz: prazywali ich palakami, a wiedamuju naśmiešku ab polskim paŭstańni — „polaki, do lasu!" — zaŭsiody tasawali da biełarusaŭ-katalikoŭ. A ksiandzy tajna paddzieržywali ŭ biełarusach pamiać i luboŭ da niaščasnaj Polščy, praročyli ab jejnym uskrašeńni i h. d. I woś tak biełaruskaja duša rwałasia na dźwie častki.

Zahubiŭšy swajo narodnaje pačućcio i swajo imia, narod naš pryniaŭ nazowu „tutejšaha," abo „prostaha." I sapraŭdy, usio „krywoje," choć wychodziła z biełaruskaha narodu, adychodziła ad jaho na zaŭsiody. Intelihiencija pryjmała, pawodle wiery, nazowu „ruskaj", abo „polskaj" i pracawała z čužymi, a wielmi časta — prociŭ swaich. Zwyčajny Marcuk-katalik, pajšoŭšy na ksiandza, nazywaŭsia užo „Marcinowski," a jahony susied—prawasłaŭny, pajšoŭšy na papa, nazywaŭsia „Martynow." Hetak praz niekalki dziesiatkaŭ hadoŭ natwaryłasia mnoha nowych proźwiščaŭ r-r-ruskich i p-p-polskich; a choć u niekatorych proźwiščy astalisia staryja, to ŭsioroŭna duch zakwasiŭsia i padfarbawaŭsia na čužy manier. Najbolšymi „ruskimi" bywali ŭradoŭcy, taknazywanyja „čynadrały;" a najbolš „polskimi" bywali nabažniejšyja žančyny-katalički. Biełaruskim astawaŭsia prosty narod, ale byŭ niaświedamy.

Hanula Jakubicha była wielmi ćwiordaj „polskaj," ale nia „polkaj," bo hetaha słowa ŭ nas tahdy nia znali. Sama Hanula čytała na ŭsialakich nabožnych knižkach i ŭmieła piajać sa dźwie kapy nabožnych pieśniaŭ. U kaściele wadziła pa stacyjach usich niačytalnych zawałackich babulak; była prypisana da niejkaha, jak kazali, zakonu i štodzień chadziła da kaścioła. U hetakim wonkawym nabaženstwie Hanula ŭsiožtyki nie zahubiła hłybokaj pabožnaści, što dosić časta zdarałasia z padkaścielnymi babulkami.

Ad niejkaha času Hanula stała pryjmać dziaciej na nawuku čytańnia. Pisać Hanula nia ŭmieła i sama, dyj nichto tady hetaha nie damahaŭsia. Hetaj zimoju, kali Wincusiu skončyłasia siem hadoŭ, Hanula pryniała ŭ swaju školu dziesiatak padrostkaŭ — roznaha wieku, zdolnaści i stanu: najbolšaja i najtupiejšaja wučanica, Wikta, mieła ŭžo dwanaccać hadoŭ z hakam i wučyłasia ŭžo hod treci. Najmienšy byŭ Hanulin Wincuś, a najadważniejšy z usich byŭ Kastuś Jurewič, syn stalara z Krywoha pierawułku.

Absieŭšy kruhom stoł, usie dziesiaciera hryźli „dyscipułki" i zubryli abecedu. Hanula pry hetym prała na kałaŭrotku woŭnu, abo rabiła prostuju rukawicu na hrubych prutkoch, ci dalikatnuju rukawičku na tonkich ihlicach. U hetaj „škole" było stolki klasaŭ, kolki wučniaŭ: kožny mieŭ swoj lemantar, ci nabožnuju knižku, pakazywaŭ „dyścipułkaj" sam sabie swaju niezaležnuju lekcyju i bubnieŭ sabie pad nos. Hanula ad pary da pary zaklikała pa paradku, ci na wybar chłapčuka, ci dziaŭčynku „wydawać lekciju:" toj padsiadaŭ bližej da kałaŭrota, čytaŭ, bekaŭ-mekaŭ i... waročaŭsia nazad. Kali lekcyja prajšła hładka, wučań dastawaŭ nowuju porcyju — dwa radočki dalej; ale čaściej astawaŭsia na starym miejscy praz cełу dzień, ci nawiet i nazaŭtra. A byli j takija „ŭboiny," što pieradłubaŭšy dyscipułkaj i horka pierapłakaŭšy paru bačynaŭ lemantara, sieli makam i dalš nie pajšli. Takija, pośle hodu nawuki, adychodzili „z woŭčym bialetam" da chaty. Taja-ž durnaja Wikta, katoruju baćki ŭpiorlisia nawučyć čytać, jašče ŭ druhim hodzie nie mahła adroźnić „žet" ad „ziet," choć ździorła dwa lemantary.

Pamahała Hanuli jejnaja siastra i haspadynia hetaje chaty, Maryla Piatrowičycha. Jana-ž zatoje brała paławinu ŭsiej płaty, jak kazała: „za swaju chatu, a tak-ža za łaŭki, stoł, za pomač i biespakojstwa." Tak jana rastłumačyła Hanuli j tak jano ŭžo astałosia, bo Maryla była haspadyniaj. Pomač, praŭda, była, tak skazać, nijakaja, bo Maryla nia ŭčyła dzicia, stajała kala piečy i dahladała haspadarki; a nawiet nie zhadžałasia z Hanulaj u prahramie: wyhawarywała „wieńć" i „kršyš," kali Hanula wučyła kazać: «wienć" i "kšyž." Hanula ličyła siabie pakryŭdžanaj i bywali pry hetym cichija sprečki i dalikatnyja prytyčki; až narešcie, jak pryjechaŭ u Zawałaku nowy ksiondz wikary— saŭsim jašče małady, ale wielmi pabožny i nawučny — dyk jon pahadziŭ na spowiedzi ŭsie sprečnyja punkty. Siostry padzialili dziaciej pamiž saboju i pahadzilisia nazaŭsiody. I tut adnak-ža Maryla pierawažyła: ŭziała sabie troje dziaciej, ale z bahaciejšych chataŭ, što płatu ŭnosili akuratna. Hanuli

Прыняты так-жа пастановы і рэзалюцыі, якія друкуем у гэтым нумары.

Пастановы.

Агульны сход Беларускага Нацыянальнага Камітэту, выслухаўшы справаздачу з дзейнасьці Прэзыдыюму і Камітэту за 1933-34 год і пасьля дыскусіі над гэтай справаздачай, пастанавіў:

1) Справаздачу прыняць да ведама.

2) Прэзыдыюму К-ту, прызнаючы яго палітыку і дзейнасьць правільнымі, выразіць поўны давер.

3) Прымаючы да ведама справаздачу папярэдняга прэзыдыюму, агульны Сход наказвае Прэзыдыюму новавыбранаму кіравацца і далей палітыкай папярэдняй, маючы на мэце палітычны ідэал Беларускага народу, выражаны актам 25.III.1918 г. — яго поўную незалежнасьць.

4) Урэшце, дзеля няспрыяючага для Беларусаў новага самаўрадавага закону, паводле якога расьпісаны ўжо выбары ў гарадзкія самаўрады нашага Краю, а так-жа помнячы тое, што дзеялася на беларускіх землях пры выбарах у Сойм і ў гмінныя рады — Сход Камітэту пастанаўляе агулам ад выбараў у гарадзкія Рады на абшары Зах. Беларусі ўстрымацца і сваіх сьпіскаў не выстаўляць, пакідаючы вольную руку для тых мясцоў, дзе выпадкова варункі склаліся йнакш.

Прэзыдыюм Бел. Нац. К-ту пасьля абнаўленьня на 1934-35 год.

На першым паседжаньні сяброў Прэзыдыюму Бел. Нац. К-ту функцыі між імі падзелены гэтак: Старшыня — Я. Пазьняк, I Віцэстаршыня — В. Багдановіч, II Віцэстаршыня — М. Манцэвіч, Скарбнік — інж. А. Клімовіч, Сэкрэтар — Ул. Казлоўскі.

V.

ВЫЯСЬНЕНЬНЕ
ПРЭЗЫДЫЮМУ БЕЛАРУСКАГА НАЦ. К-ТУ У ВІЛЬНІ.

Прэзыдыюм Беларускага Нац. К-ту на паседжаньні сваім 29.V с. г., разгледзіўшы зацемку ў „Kurjery Wilenskim“ з дня 27.V. с. г. у артыкуле „Uchwały Białoruskiego Komitetu Narodowego“ аб тым, што група, якую рэпрэзэнтуе грам. В. Багдановіч, жадала ад сходу Бел. Нац. К-ту з 23.V. с. г., каб ён забраў назад быццам выражаную ей нагану Прав. Камісіяй пры тым-жа Камітэце ў мінулым годзе за масквафільскую дзейнасьць, гэтым сьцьвярджае, што такой наганы групе В. Багдановіча з боку Правасл. Камісіі ня было ніколі.

На тым-жа паседжаньні Прэзыдыюм Бел. Нац. К-ту разглядаў так-жа артыкул „Nowe oblicze Białoruskiego Komitetu Narodowego w Wilnie“ у „Kurjery Porannym“ з 27.V. с. г. Артыкул гэты той факт, што пасол Ф. Ярэміч на сходзе Нац. К-ту з 23.V. с. г. ня быў выбраны ў Прэзыдыюм таго-ж К-ту ў Вільні, тлумача, як ізоляцыю яго дасюлешняй опозыцыйнай палітыкі да польскага ўраду, якую ён праводзіў у польскім парляманце быццам панад апініяй беларусаў усіх кірункаў. Прэзыдыюм Бел. Нац. К-ту сьцьвярджае, што неўваход пасла Ф. Ярэміча ў Прэзыдыюм гэтага К-ту ня мае ў сабе характару палітычнага, а так-жа, што палітыку ў Сойме пас. Ф. Ярэміч вёў ад імя Бел. Нац. К-ту і што Камітэт гэты дасюлешняй сваей палітыкі не зьмяніў.

Нявыбар пасла Ф. Ярэміча ў Прэзыдыюм не зьмяняе так-жа дасюлешняй палітыкі Камітэту і на будучыню.

(—) *Я. Пазьняк* Старшыня К-ту. (—) *Ул. Казлоўскі* Сэкрэтар.

Вільня, 29.V.1934.

Водгукі агульнага сходу Бел. Нац. К-ту ў Вільні.

„Kur. Wil.“ з дня 27 V. с. г., падаўшы агульны зьмест пастановаў сходу Бел. Нац. К-ту, робіць нязгодную з праўдай увагу, што быццам гэны-ж сход, не згаджаючыся з масквафільскім кірункам некаторых сяброў К-ту (з групы В. Багдановіча), уважаў за слушную палітыку Праваслаўнай Камісіі пры Нац. К-тэце.

З гэтакай зацемкі „Kur. Wil.“ можна думаць, што царкоўная палітыка Праваслаўнай Камісіі пры Нац. К-тэце ідзе ў кірунку полёнофільскім. Вось-жа выясьняем, што палітыка гэтай Камісіі пры Бел. Нац. К-тэце, як і агулам беларуская нацыянальная палітыка, ідзе ў кірунку ані масквафільскім, ані полёнафільскім, але выключна беларускім.

Урэшце той-жа „Kur. Wil.“ падсьмейваецца з „gromkich“ рэзалюцыяў Бел. Нац. К-ту і... дараджае яму ні больш, ні менш, як супрацоўніцтва з урадам.

Уважаем за лішняе адказываць „Kur. Wil.“ на ягоную цынічную раду, а толькі запытаем у яго, што добрае прынесла беларускаму народу пад Польшчай супрацоўніцтва з урадам Луцкевіча і Астроўскага?

Так-жа чыста падэфэнзыўнаму паінфармаваў аб беларускім жыцьці з нагоды абнаўленьня Бел. Нац. К-ту і варшаўскі „Kur. Por.“ з 27.V. сёл. году, сьведама баламуцячы яго грамадзкую апінію, што пасол Ф. Ярэміч выступаў у Сойме быццам выключна ад свайго імя і над галовамі ўсіх беларусаў. Як з гэтым усім ёсьць сапраўды, дае свае выясьненьні Прэзыдыюм Бел. Нац. К-ту. Мы тут адно толькі выражаем сваё зьдзіўленьне з „культурных мэтаў“ польскай буржуазнай прэсы і яе пісакаў, а так-жа сьцьвярджаем, што загнаць у дэфэнзыву беларускае арганізаванае грамадзянства, каб яго зьнішчыць і гэтым спыніць адраджэньне бел. народу, ня ўдасца напэўна.

—j—

✝ Мікола Вяршынін.

Яшчэ летась у гэту пару паміж беларусамі — абсольвэнтамі вышэйшых школ у Чэхаславаччыне актуальнай была думка ушанаваць на леташні год прыпадаючыя 70-тыя ўгодкі жыцьця і працы ведамага беларускага палітычнага і грамадзкага дзеяча на эміграцыі — Міколы Вяршыніна. З нявытлумачаных дагэтуль прычын да праектаванага сьвяткаваньня аднак не дайшло.

Сёлета-ж, 6-га траўня*) М. Вяршынін ужо разлучыўся з гэтым сьветам на заўсёды.

Невялікая беларуская калёнія ў Празе ўтраціла ў нябожчыку свайго найстарэйшага прадстаўніка, усё беларускае грамадзянства — пільнага і чуйнага на грунце міжнародным барацьбіта, рэдакцыя „Бел. Крыніцы“ ўрэшце — сумленнага супрацоўніка — корэспондэнта.

Асоба памёршага, з увагі на ягоную працу і становішча заслугоўвае на шырэйшае пазнаньне. На вялікі аднак жаль, весткі аб жыцьці няб. М. Вяршыніна вельмі скупыя, нават у тых, хто з Нябожчыкам спатыкаўся. Ведама толькі, што паходзіў М. Вяршынін з сяньняшняй Наваградчыны, аб каторай гэтак любіў успамінаць і гаварыць і з каторай расстаўся яшчэ прад 30-цю блізу гадамі, уцякаючы тады заграніцу ад прасьледу царскага ўраду за ўчасьце ў рэвалюцыйнай рабоце 1904—5 г. Адным з апошніх мясцоў тагочаснай дзейнасьці В—на была Рыга.

Апынуўшыся заграніцай правандраваў М. Вяршынін літэральна цэлую цэнтральную і заходнюю Эўропу, закранаючы пралётам і поўдзень. Даўжэйшы час затрымоўваўся ў Нямеччыне (Дрэздэн), Англіі (Лёндын), Францыі, Італіі (Вэнэцыя), аж нешта каля 1907 г. апынуўся ў сталіцы Чэхіі—Залатой Празе, дзе затрымаўся аж да самай сваей сьмерці.

Апошнія гады перад сусьветнай вайной няб. М. В—н працаваў сэкрэтаром і бібліятэкарам у праскім Т-ве ім. Л. М. Талстота і быў вучыцелям моваў як у школах, так і прыватна. На гэту пару прыпадае знаёмства і сувязь Нябожчыка з перадавымі працаўнікамі чэскага адраджэньня, у тым ліку і з сучасным прэзыдэнтам Чэхаславаччыны, праф. Т. Г, Масарыкам.

Калі пад канец сусьветнай вайны беларуская справа пачала выплываць на міжнароднае форум, нябожчык В—н быў ужо ў першых радох актыўных беларускіх працаўнікоў на міжнародным полі; Яму таксама прыпала чэсьць і абавязак быць дыплёматычным прадстаўніком Ураду Бел. Народнай Рэспублікі пры Урадзе рэспублікі Чэхаславацкай.

Дальшыя палітычныя выпадкі ставілі іншыя вымогі. Нябожчык аднак і тут блізу бяззьменна да самай сьмерці працуе ў першай лініі: Ён зьяўляецца гаспадаром беларускай палітычнай конфэрэнцыі ў Празе ў 1921 г., Ён выстараўся перад чэскімі ўладамі сто з лішнім стыпэндыяў для беларускага студэнства, Ён стаяў у чале „Беларускай Грамады“, „Беларускай Рады“ і „Беларускага Архіву“ у Празе, Ён няўтомна працаваў над усьведамленьнем заграніцы аб беларускай справе, аддаючыся гэтай працы да самай сьмерці цалком і безінтэрэсоўна.

Паміма доўгага прабываньня заграніцай, нябожчык аднак ўсьцяж мрыяў аб бацькаўшчыне, апісваючы яе (напр. Налібоцкую пушчу), ў сваіх нідзе дагэтуль недрукаваных успамінах, у каторых не адно хіба можна было-б знайсьці, што адхінула-б не адну тайну, якімі, міма ўсё, акрыта прошлае асобы нябожчыка М. В—на.

А зрабіць гэта для гісторыі нашага адраджэньня трэба. Устанавіць трэба шмат што, ня выключаючы нават і таго, ці няб. Вяр-

*) а ня 7-га, як памылкова падавала беларуская прэса, асноўваючыся толькі на ведамым дню хаўтуроў — 9-га траўня 1934 г.

---

dastalisia dzieci biadniejšyja i tupiejšyja, z wialikaj durnoj Wiktaj, katoraja wučyłasia drenna, a płaciła jašče horš.

Škoła była ŭ supolnaj chacie, hdzie apryč siamji haspadarskaj i Hanuli i Wincusiom, a tak-ža dziesiaciarych wučniaŭ, chadzili jašče pa chacie kury z siardzitym pieŭniem na čale. Dzieci bubnieli swaje litary j składy, Hanulin kałaŭrotak burčeŭ swaju panuruju pieśniu, Marylina Julačka płakała ŭ kałyscy, Tamaš kuryŭ papiarosu; Maryla chadziła kala piečy, hdzie časta na patelni skwirčeŭ blin i pachnuŭ na ŭsiu chatu, a kury tymčasam sakatali j kudachkali i... ŭsie swaje patreby spraŭlali na miejscy.

Najspakajniejšy ŭ cełaj hramadzie byŭ sam haspadar, Tamaš, muž Maryli, čaławiek pracawity jak woł, małamoŭny i krychu hłuchawaty. Da taho — jon redka bywaŭ u chacie; najčaściej pracawaŭ u humnie, hdzie sam adzin doŭhimi hadzinami małaciŭ, wybiwajučy raŭnamierna snop pa snapie. Humno było samym najmilejšym miejscam Tamaša: tam jon z niejkim asabliwym smakam i nabaženstwam nawodziŭ paradak, čyściŭ i padmiataŭ; a mieŭ takuju zručnaść u rucce i mieru ŭ woku, što luba było pahladzieć na jahonuju rabotu! Bywała, Tamaš zasiadzie na kałodačcy wieić žyta: maje mileńkija, jak jon wiejaŭ! Braŭ u wiejałku zaŭsiody raŭniusieńkuju mieru, a pośle špurhaŭ zbožža ŭ pawietra; ziarniatki z niejkim miłahučnym świstam i šumam saskakiwali z wiejałki, wyrywalisia napieraboj z miakiny i padali ŭ kaniec toku roŭnym i zhrabnym paŭkruham. Miakina biaz šumu, roŭnieńka asiadała na samaj siaredzinie toku. Tamaš aściarožna razhraničwaŭ čystaje ziarno ad miakiny, adkidaŭ dałoŭ kamienčyki i kałaski; ssypaŭ čystaje zbožža ŭ biełyja pałatnianyja miaški i pieranosiŭ u sieni, hdzie ssypaŭ jaho ŭ wialikija kubły; a miakinu źbiraŭ u horšyja miachi i pieranosiŭ u adumysłowyja zastaranki.

Taksama paradkam umieŭ Tamaš haspadaryć u chlawie: z swaim kańkom i karoŭkaj žyŭ u najlepšaj zhodzie, hawaryŭ z imi, jak z razumnymi ludźmi, a jany jaho niejak dobra razumieli. Świrna Tamaš nia mieŭ: u wialikich sieniach byli parobleny roznyja składy i schowy dla zbožža, i stajali kufry dla roznaj drabiazy.

Časami Tamaš prynosiŭ rabotu ŭ chatu: tahdy zasiadaŭ na kałodačcy kala piečy, ščapaŭ łučynu, ci wiazaŭ wieniki, abo... kuryŭ papiarosu. Ale Maryla wielmi nia hubiła tabačnaha dymu; wiečna z mužam swaryłasia za kureńnie, adnak tut Tamaš byŭ ćwiordy, jak kamień: maŭčaŭ, ale kuryŭ pastajanna. Tahdy Maryla, jakby nienarokam, padkidała mužu swaju rabotu: dawała skubać pierje, abo woŭnu; heta była dosić kłapatliwaja rabota dla mužčynskaha charaktaru i wielmi dalikatnaja dla Tamašowych hrubych palcaŭ. Adnak Tamaš rabiŭ heta nia horš, čym jakaja babula swaimi tonkimi palčykami. Kali Julačka pačynała płakać, Maryla hawaryła mužu:

— Pakałyšy dzicia, čuješ — wun, jak płača: tut-ža i twaja paławina... Niaŭžo-ž ja adna pawinna zaŭsiody pakutawać?

Tahdy Tamaš siadaŭ na łožka i raŭnamierna hojdaŭ kałysku, padpiawajučy i hawaračy da Julački. A jak heta nie pamahała, tahdy wyjmaŭ jaje z kałyski, piaściŭ, cmokaŭ, śmiajaŭsia, i tak umieŭ razwiesialić płaksu, što i jana pačynała śmiajacca. Tahdy sadziŭ dačušku na swaju wializarnuju dałoń, wyihrywaŭ hubami roznyja maršy i tancy, wynosiŭ jaje na siaredzinu chaty i, hojdajučy na dałoni, kruciŭ na adnej rucce, jak cacačku, i ŭznosiŭ u haru až pad samuju stol. Pry hetym nia było nikoli nijakaha wypadku: dziaŭčynka śmiajałasia sardečna, a pośle nawučyłasia ŭ takt plaskać rukami. Tahdy ŭsie dzieci zabywalisia ab swaich lekcijach i lemantaroch, hublali swaje dyscipułki, wychodzili z-za stała; cmokali i śmiajalisia da Julački i ŭsim u chacie było wiesieła.

Najbolšym herojem u hetaj škole byŭ Kastuś Jurewič, stalaroŭ syn, wučań Maryli Piatrowičychi: jon biŭsia z usimi dziaćmi, dawaŭ usim proźwiščy, časta płakaŭ, ale jašče čaściej śmiajaŭsia — i to tak hołasna, što heta nie padabałasia anikomu. Nawiet piewień časta swaryŭsia na jaho: „kudy ty, taki-hetaki!“ Adnak, pamima ŭsiaho, Kastusia lubili: čyrwony, pucaławaty, wiečny palatun — jon byŭ admienienym typam ad Hanulinaha Wincusia, katory taksama byŭ žywy i wiasioły, ale z niejkaj hłybokaj zadumaj; stydliwy j bajaźliwy pry čužych ludziach.

A piewień, jak nazywali „hałahanski,“ čuŭsia pasiarod chaty poŭnym haspadarom: łapataŭ kryllami, piajaŭ zakacista, adwodziačy notu pa składoch, ćwiorda j jasna, jak by chacieŭ prystydzić dziaciej, katoryja na składoch zaikalisia, ci abrywalisia saŭsim. Adpiajaŭšy, swajo „ku-ku ry-ku“, piewień adwodziŭ niejak asabliwa druhuju karaciejšuju notu minarowym tonam, jak-by addajučy recha swajej pieśni, i zara padjaždžaŭ na adnym kryle, łaskawa uchmyliŭšysia, da čubataj kurački. Jak niezaležny haspadar, piewień ani dumaŭ dzieciam ustupać z darohi: łupiŭ dziuboju pa nahach i nia daŭ pierachodu. Biednaj Wikci (jak-to kažuć: „na kaho Boh, na taho i ludzi“), raz nawiet skočyŭ na haławu. Tolki ŭstupaŭ i bajaŭsia Kastusia, bo toj wyrwaŭ jamu adzin raz, jak nikoha nia było ŭ chacie, samaje najdaŭžejšaje i najpryhažejšaje piaro z chwasta. Ad hetaha piewień zhubiŭ kusok fantazii, spuściŭ ton i pačuwaŭsia strašenna pakryŭdžanym. A Kastuś dastaŭ za heta ad Maryli za wucha i stajaŭ ciełuju hadzinu na kalenkach, ale fantazii nia straciŭ.

шынін быў сапраўды — Вяршыні-нам.

Які-б вынік гэтых досьледаў ня быў, пэўным будзе на векі адно, што Нябожчык для справы беларускай вельмі заслужыўся. Памяць па Ім захаваюць пакаленьні.

Пахаваны М. Вяршынін 9 траўня 1934 г. на праскіх могілках „na Olšanech", пры ўдзеле праваслаўнага архіепіскапа Савація (чэха). Сярод жалобных гасьцей быў на могілках і праф. Д—р Ян Славік —кіраўнік славянскіх архіваў пры Міністэрстве загр. спраў Чсл. Рэспублікі і пратэктар Беларускага заграніч-нага архіву ў Празе. На магілу нябожчыка паложана было шмат вянкоў, сярод каторых выдзяляўся вянок сплецены з бел-чырвона-белых кветак, а на ім стужка ў такіх-жа беларускіх нацыянальных колерах з надпісам: „Мікалаю Вяршыніну — Змагару за волю і незалежнасьць Беларусі—яго сябры."

* * *

Яшчэ адна сьвежая магіла, яшчэ адна прэрва ў радзеючых радох „старой беларускай гвардыі." Міколы Вяршыніна паміж жывымі ўжо няма. Для беларускіх бывальцаў Прагі ня лёгка згадзіцца з думкай, што скромнае, ціхае і гэтак міла-гасьціннае памешканьне ў Празе II. Wenzigova 4, гэты сапраўдны, заўсёды адчынены готэль для ўсіх заблуканых у чужыне беларусоў — ужо не ажыўляецца дабрадушнай хвігурай крыху пахіленага старца, які ў кожным спатканым на чужыні беларусе хацеў бачыць брата і сына і які за сваю шчырасьць, за сваю дабрату гэтулькі і гэтулькі меў... прыкрасьцяў.

То-ж даруй нам усім з таго Сьвету, дарагі і незабудны „Дзядзька В...*), нашы перад Табой правіненьні, а мы, што бачылі і падзіўлялі Тваю веру ў будучыню Беларусі і Тваю для Яе ахвярную да астатка працу, — не забудзем, самі ня здрадзім і будучыні перакажам гэта як найбольшы скарб.

Інж. Ад. Клімовіч
б. пражак.

*) гэтак звалі Нябожчыка мы, студэнты.

БЕЛАРУСКАЯ ХРОНІКА.

Агульны Сход Т-ва Бел. Школы Галоўнаю Управаю вызначаны на 17 чэрвеня г. г. у 12 гадзін дня ў Вільні, у памешканьні Беларускага Банку (Каралеўская вул. №3 кв. 8).

З выдавецкае нівы: Гэтымі днямі выйшлі з друку: „На сонечны бераг!"—зборнік вершаў Міхася Машары, з партрэтам аўтора, у прыгожай вокладцы. Кніжыца гэта мае 80 бач. і каштуе 1 зл.

„Шлях Моладзі", № 5 — травень 1934 г., часопісь беларускай моладзі.

„Самапомач", № 5, травень 1934 г., беларуская коопэратыўна-гаспадарчая часопісь.

„Да Злучэньня", № 6, травень 1934 год.

Канфіската. „Новы Шлях" орган Беларускіх Нацыянал—Соцыялістаў, № 2, з 25 траўня 1934 г. выйшаў з друку і на другі дзень адміністрацыйнымі ўладамі сканфіскаваны.

„Бел. Крыніца" у м-цы чэрвені выйдзе тры разы, з датай 5, 15 і 25-га.

Арышт старшыні Беларускага Аддзелу пры Мін. Асьветы ў Латвіі. Пасьля апошняга дзяржаўнага перавароту ў Латвіі, новыя латвійскія ўлады арыштавалі Старшыню Беларускага Аддзелу пры Міністэрстве Асьветы ў Латвіі, ведамага тамашняга беларускага дзеяча грам. Пігулеўскага.

Цікава, хто цяпер будзе кіраваць гэтым аддзелам і ці будзе захаваны сам аддзел?

Беларускі хор праз радыё. 22 г. м. увечары з рыскай радыё-станцыі пяяў беларускі хор пад кіраўніцтвам грам. М. Грыўскага народныя беларускія песьні

ДАКУМАНТ ДНЯ.

Трудныя, калі не казаць, што сусім немагчымыя варункі працы на беларускай коопэратыўнай ніве дасканальна ілюструе дакумант зьмешчаны ў апошнім нумары (№ 5, м-ц травень 1934 г.) беларускай коопэратыўна-гаспадарчай часопісі „Самапомач". Дакумант гэты у арыгінальнай форме і ў зацьверджаным англіцкім перакладзе прысяжнога тлумача — зьмяшчаем ніжэй даслоўна для арыентацыі нашых паважаных чытачоў. Загаловак „Самапомачы" над гэтым дакумэнтам пакідаем таксама бяз зьмены.

За чый грэх — за чыю віну?

(*Замест «На дзень коопэрацыі»*).

Translated from Polish and White-Russ.

For whose sin — for whose fault?

(*Instead of „On the day of cooperation"*).

Odpis.

URZĄD WOJEWÓDZKI
Nowogródzki
Wydział Bezpieczeństwa

L. BP. 214/I.
Przedmiot:

Nowogródek,
dn. 21 lutego 1934 r.

DECYZJA.

Orzeczeniem z dnia 25/I—34 r. L. BP. 345/8 Starosta powiatowy w Nowogródku działając na mocy art. 72 i 75 rozporządzenia Prezydenta R. P. z dnia 22/III—1928 r. o postępowaniu administracyjnem (Dz. U. R. P. Nr. 36 z roku 1928) oraz art. 9 ustawy o zgromadzeniach z dnia 11 marca 1932 r. (Dz. U. R. P. Nr. 48 z roku 1932), nie przyjął do wiadomości zawiadomienia założycieli spółdzielni w Niehniewiczach z dnia 18/I—1934 r. i z uwagi na spokój i porządek publiczny zakazał urządzenia przez Romana Lecko zgromadzenia w Niehniewiczach w sprawie zorganizowania spółdzielni białoruskiej. —

Po rozpatrzeniu akt sprawy oraz odwołania Romana Lecko z dnia 8/II—rb. wniesionego w terminie przepisanym — na zasadzie art. 93 rozporz. Prezydenta R. P. z dnia 22 II—28 r. o postępowaniu administracyjnem (Dz. U. R. P. Nr. 36 poz. 341) Urząd Wojewódzki Nowogródzki

postanawia:

odwołanie Romana Lecko z dnia 8.II. rb. odrzucić, a zaskarżoną decyzję Starosty powiatowego w Nowogródku z dnia 25/I—34 r. Nr. BP. 345/8 zatwierdzić jako uzasadnioną z motywów podanych w cytowanem orzeczeniu. —

Decyzja niniejsza jest ostateczna w administracyjnym toku instancji, co nie wyklucza ewentualnego uprawnienia do wniesienia skargi do Najwyższego Trybunału Administracyjnego. —

Za Wojewodę
(—) *M. Jasiński* (M. Jasiński).
Naczelnik Wydziału.

Ja, Józef Wierzyński, Tłumacz Przysięgły przy Sądzie Okręgowym w Wilnie zaświadczam zgodność odpisu i tłumaczenia powyższego z oryginałem przedstawionym mi przez p. Inż. Adolfa Klimowicza zamieszkał. w/m. ul. Połocka 4 m. 10. — Wilno, dnia 24 maja 1934 r.

(—) *J. Wierzyński.*

Copy.

WAYWODE-OFFICE
of Nowogródek
Security Department.

Nr. 214/I. Publ. Secur.
Subject:

Nowogrodek,
February 21, 1934.

DECISION.

The decision on the 25th day of January 1934, Secur. Dept. Nr. 345/8, the Starost of the District of Nowogródek acting on the power of Art. 72 and 75 of arrangement of President of the Republic of Poland on the 22nd day of March 1928 of the procedure of administration (Official Journal of the Republic of Poland, Nr. 36, year 1928) and Art. 9 law concerning meetings on the day of the 11th of March 1932, (Off. Journ. of the Rep. of Poland, Nr. 48, year 1932), — did not take note of the information from the founders of the cooperative Company at Niehniewicze on the day 18th of Jan. 1934, and with regard to the quiet and public order prohibited the holding of the meeting by Roman Lecko at Niehniewicze for the purpose of organization of White Russian cooperative-company.

After considering the act of the process and the repeal of Roman Lecko on the 8th day of Febr. 1934, forwarded at the prescribed term, on the ground of Art. 93 of the arrangem. of the Presid. of the Rep. of Poland from 22.II.28 of the procedure of administration (Offic. Journ. of Rep. of Poland, Nr. 36, pos. 341),—the Waywode-Office at Nowogródek

resolves:

to reject the repeal of Roman Lecko on the 8.II.1934, but the rejects of the decision of Starost of Nowogródek Distr. on 25.I.34, Nr. 345/8 Publ. Sec. — to confirm as based on the motives given in the quoted decision.

The present decision is the final one in the Administration of the last resort, but does not exclude possible rights to carry the complaint to the Highest Court of Administration.

Instead of Waywode
(—) *M. Jasiński*
Chief of the Depart.

I, Józef Wierzyński, the Sworn Translator by the Circuit-Court at Wilno, atteste the conformity of the translation above to the original, presented to me by Ing. Adolf Klimowicz, residing at Wilno, Połocka-Street 4/10. Wilno, the 24 May 1934.

(—) *J. Wierzyński.*

SIGILLUM.

30-lećcie swabody litoŭskaha druku.

Sioleta 7.V minuła 30 hadoŭ, jak carskaja rasiejskaja ŭłada, skasawaŭšy swaju zabaronu drukawać litoŭskija knižki i hazety łacinskimi litarami, u 1904 h. drukawańnie heta dazwoliła. Woś ža ŭ litoŭskich hazetach spatykajem adpawiednyja artykuły, pryświačanyja hetamu asabliwamu jubileju. Z adnym z ich „anei rašto, anei druko (ani piśmu, ani druku) ŭ „Viln. Ryt. (16 V), jaki abhawarwaje adnosiny ŭ historyi da litoŭcaŭ nia tolki rasiejcaŭ, ale i palakoŭ, cikawa budzie i karysna paznajomicca i nam.

...„Haworačy ab palakoch, — čytajem u henym artykule — musimo pradusim śćwierdzić, što ŭ historyi litoŭskaha narodu pahanuju rol adyhraŭ nie narod polski, a tolki našy pany-abšarniki. Jany, roznymi sposabami nabyŭšy ŭ Litwie wialikija abšary ziamli i zbudawaŭšy na ich raskošnyja pałacy, pierakinulisia na staranu palakoŭ i adharadzilisia ad litoŭskaha narodu najwyšejšym muram. U dwaroch była kultura, a ŭ wakolicach nichto nia ŭmieŭ ani čytać, ani pisać. Pryhonnych sialan zmušali tolki pracawać na karyść pana, a ab aświecie ich susim nia dumali. Čamu? A tamu, što pany duža dobra razumieli, što kali narod aświecicca, to doŭha na karyść dworu pracawać nia budzie. Pomniačy ab hetym, nia ździwimsia, što ŭwa ŭsiej Litwie ni adzin pan nie pastawiŭ ani adnej škoły i nia trymaŭ ani adnaho wučyciela, jaki-by wučyŭ dziaciej pryhonnych ludziej.

Praŭda, paśla skasawańnia panščyny, kali pačała paŭstawać siarod wiaskowych ludziej aświeta, časami hdzie jakaja pania dla razryŭki i wučyła dziaciej parabkoŭ, adnak wučeńnie heta nie datyčyła šyrokich sialanskich masaŭ i historyja dla panoŭ maje tolki adzin prysud: jany, aprača ich niahodnaj roli palityčnaj u Litwie, byli ŭ joj zapynščykami kultury.

Ale zwolniŭšysia ad panščyny ŭ 1863 h., litoŭski narod u nastupnym hodzie spatkaŭsia z nowym udaram: mahutnyja biurakraty ciomnaj Rasiei zabaranili litoŭcam drukawać łacinskimi litarami knižki i hazety. Jany dobra razumieli, što litoŭcy, budučy katalikami i prywykšy da łacinskich litaraŭ užo niekalki sot hadoŭ, dabrawolna nie zdaducca. Dyk idučy da swajej mety, carskija biurakraty nie rachawalisia z ničym. Adnak daremna. Zadušyć litoŭski narod jany nie zmahli. Časć litoŭcaŭ abjawiła hnibicialam śmiarotnuju baraćbu, a inšyja ŭznoŭ pastanawili trymacca da apošniaha. Baraćba ciahnułasia praz 40 hadoŭ i tolki 7 traŭsia 1904 h. ŭsia Litwa addychnuła lahčej—jana atrymała ŭreście swabodu presy"...

I tak, małaja, padniawolnaja Litwa, abaraniła swajo światoje prawa ad mahutnaj, uzbrojenaj z noh da haławy Rasiei. Była heta widawočnaja pieramoha sprawiadliwaści.

Litoŭskaja heta pieramoha jak-ža šmat u čym wuča i šmat da čaho zaachwočwaje i nas biełarusaŭ u našaj adradženska-wyzwolnaj baraćbie!

P. Łuhanowič.

Roznyja wiestki.

Z POLŠČY.

Wybary. Nadowiačy wa ŭsiej Polščy ŭ mienšych haradoch adbylisia samaŭradawyja wybary ŭ haradzkija rady. U hetych „wybarach", taksama jak u hminnyja rady „pieramahła" partyja B.B.

Niełady ŭ „Lehijonie Młodych". „Lehijon Młodych" heta polskaja arhanizacyja, pierawažna moładzi, jakoj syta apiakujecca polski ŭrad. Ab ideolohii hetaj arhanizacyi mała było čuwacca, wiedama było tolki, što kali chto z „maładych" chacieŭ dastać jakujuś pasadu, asabliwa lepš apłačwanuju, dyk musiŭ naležać da „Lehijonu". Kali-ž apošnim časam z „pasadami" stała ciesna, dyk u „Lehijonie" pačalisia swarki za pasady ŭžo zajmanyja. Da hetaha ahniu daliła jšče aliwy adozwa polskaha katalickaha episkapatu, u jakoj byli pastaŭleny „Lehijonu" zakidy jahonaj warožaści da kaściołu i relihii naahuł.

Z ZAHRANICY.

Japonija, Niamieččyna i Polšč prociŭ Sawietaŭ? Zahraničnyja hazety publikujuć wiestku padadzienuju bal šawickaj hazetaj „Prawda", hetkaha źmiestu: Japonski admirał Matuzita ŭ hutarkach z tureckimi dziaržaŭnymi pradstaŭnikami miž inšym skazaŭ, što isnuje niamiecka-japonska-polski dahawor suproć Sawietaŭ.—Hetaja wiestka mocna trywožyć balšawikoŭ.

Wybary prezydenta ŭ Čechasławaččynie. Nadowiačy adbylisia ŭ Čechasławaččynie wybary prezydenta. Wybrany na prez. T. Masaryk. Treba zaznačyć, što hety pawadyr českaha narodu wybrany na prezydenta ŭžo čaćwierty raz.

Dziaržaŭny pierawarot u Baŭharyi adbyŭsia ŭ noč z 18 na 19 traŭnia. Nowy ŭrad składajecca pierawažna z ludziej wajskowych i namierany kirawać krajem pry pomačy dyktatury.

Z KRAJU.

Wybary ŭ haradzkija rady. 27 h. m adbylisia wa ŭsich haradkoch našaha Kraju, aprača Wilni i Horadni, wybary ŭ haradzkija rady. Usiudy „pieramahła" partyja B.B.

U Nawahradčynie adbylisia „wybary" biaz wybaraŭ, tak jak adbylisia ŭ hminnyja rady. U Wilenščynie było krychu inakš; było i hałasawańnie i byli biełaruskija śpiski. Prykładam: u Maładečnie i Wialejcy biełaruski śpisak atrymaŭ pa 4 mandaty.

Redaktar Jan Paźniak
Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1—3.
Wydawiec: A. Šutowič